Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

25 САКАВІКА 2016 г. ПЯТНІЦА № 55 (28165) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Камунальныя тарыфы павышацца не будуць**

СТАР. 2



**«Мінск і мінчане», якія здзіўляюць**

СТАР. 5



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

*ЛІЧБА ДНЯ*

**63 715**

*Гэта сярэдняя колькасць выбаршчыкаў на выбарчую акругу па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі шостага склікання. Цэнтральная камісія ўстанаўлівае гэтую лічбу не пазней за пяць месяцаў да заканчэння тэрміну паўнамоцтваў Палаты прадстаўнікоў дзеючага склікання, зыходзячы з колькасці выбаршчыкаў пры правядзенні апошніх выбараў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.03.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 20278,00 | ▲ |
| Еўра | 22632,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 293,95 | ▼ |
| Укр. грыўня | 773,08 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Палескія лодкі Пінчука



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхар леспрамгасаўскага пасёлка Хваенск **Уладзімір ПІНЧУК** — адзіны на ўсю прыпяцкую зону спецыяліст па вырабе лодак. Шасцігадовая ўнучка Лізавета любіць назіраць за працай дзеда-ўмельца.

Да майстра звяртаюцца жыхары Турава, Давыд-Гарадка і вёсак, якія месцяцца на правым і левым берагах самай вялікай палескай ракі — палешукі па-ранейшаму карыстаюцца драўлянымі лодкамі.

СТАР. 3

■ Трагедыя

## «УСЯ ВЁСКА Ў ШОКУ», —

### гавораць аднавяскоўцы загінулых школьнікаў

**Тры школьнікі падарваліся ў Бярэзінскім раёне. Два з іх, на жаль, загінулі. Трэці шпіталізаваны. Карэспандэнты «Звязды» перадаюць з месца падзей.**

Страшная навіна за лічаныя гадзіны абляцела ўсю краіну. Школьнікі, сябры, жыхары вёскі Вяшэўка, гулялі ў полі за вёскай. Знайшлі жалезны прадмет, па папярэдняй інфармацыі — снарад часоў Вялікай Айчыннай вайны, і шuганулі яго аб камень. Вынік вам вядомы...



Фота Надзеі БУЖАН.

СТАР. 4

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

**Дзіна ДУБАДЗЕЛАВА, жыхарка в. Леніна, Добрушскі раён:**

## «Альтэрнатывы вашай газеце я не бачыла раней. І не бачу зараз»

Вы, магчыма, спытаеце, чаму? Адкажу. Па-першае, я — беларуска, вяскоўка. Думаю, размаўляю, чытаю, пішу найперш па-беларуску, як мае бацькі, дзядулі і бабулі, як нашы сябры і суседзі. Гэтай жа, роднай мове, мове карэннага насельніцтва, я вучыла дзяцей у школе. Таму здраджваць у пажылым веку, вядома ж, не даводзіцца: гэта мая мова, як і мова «Звязды». Да таго ж з ёй (прычым дзесяцігоддзямі!) мы неяк аднолькава глядзім на жыццё, радуемся, перажываем, любім.

Па-другое, новы нумар «Звязды» — гэта ў пэўным сэнсе акно ў свет. З цікавасцю і заўсёды чытаю «Розгалас», «Жырандолю», «Ігуменскі тракт», «Краіну здароўя», «Крынічку», з асалодай — «Простую мову» і «...Народ на провадзе!». Зрэдку друкуюцца там і мае бываліцы.

А яшчэ я цвёрда ведаю, што калі ў чалавека ўзнікае нейкая праблема і ён звяртаецца па дапамогу, то рэдакцыя заўсёды пастараецца разабрацца і неяк паспрыяць. У нашай вёсцы, напрыклад, досыць доўга было не праехаць па вуліцы Жодзінскай... Падрамантаваць яе ўдалося з дапамогай газеты.

Да таго ж мы, выпускнікі Магілёўскага педагагічнага інстытута 1963 года, вельмі ўдзячны «Звяздзе» за тое, што праз 50 гадоў пасля выпуску змаглі знайсці адно аднаго. Для пажылых людзей гэта, згадзіцеся, вельмі важна...

А наогул, хочацца шчыра падзякаваць калектыву газеты за самаадданую працу, пажадаць моцнага здароўя і новых творчых поспехаў — на карысць Радзімы.

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ВЫ ЯШЧЭ ПАСПЯВАЕЦЕ ПАДПІСАЦЦА НА «ЗВЯЗДУ» НА II КВАРТАЛ 2016 ГОДА!

# САМО ЖЫЦЦЁ ПРЫМУШАЕ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка абмеркаваў на сустрэчы са старшынёй Калегіі ЕЭК Тыгранам Саркісянам прыярытэтныя кірункі развіцця інтэграцыйных працэсаў на еўразійскай эканамічнай прасторы.**

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў ЕАЭС, створаным за даволі кароткі прамежак часу, досыць поспехаў, але з-за аб'ектыўных, суб'ектыўных прычын хапае і праблем. «Напружвацца давядзецца ўсім, ад камісіі ЕЭК да прэзідэнтаў і прэм'ер-міністраў, каб вывесці на высокі ўзровень функцыянавання Еўразійскі эканамічны саюз», — лічыць Прэзідэнт Беларусі.

У той жа час Аляксандр Лукашэнка з аптымізмам глядзіць у будучыню ЕАЭС. Паводле слоў беларускага лідара, само жыццё прымушае вельмі хутка рухацца ў плане станаўлення такога саюза, дзе будзе забяспечана свабода рынкаў, руху капіталу, рабочай сілы. Прэзідэнт упэўнены, што нацыянальныя праблемы краін ЕАЭС не павінны перашкаджаць развіццю агульных інтарэсаў і вырашэнню тых пытанняў, якія стаяць перад інтэграцыйным аб'яднаннем.

«У нас дарогі назад няма. Нам трэба ўдасканальваць Еўразійскі эканамічны саюз, стварыць саюз не горшы чым ЕС. У адваротным выпадку мы перад нашымі людзьмі будзем выглядаць балбатунамі», — падкрэсліў беларускі лідар.

На сустрэчы былі абмеркаваны сярэднетэрміновыя і тактычныя задачы, якія стаяць перад ЕАЭС з улікам сусветных трэндаў, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. У далейшым пасля зацвярджэння ўсімі кіраўнікамі дзяржаў-членаў гэтыя кірункі будуць пакладзены ў аснову дакумента — стратэгіі прасоўвання саюза. У свеце адбываюцца сур'ёзныя трансфармацыі, еўразійская інтэграцыя сутыкаецца з новымі выклікамі. Краінам ЕАЭС, як падкрэслівалася падчас сустрэчы, будзе лягчэй пераадольваць іх сумеснымі намаганнямі.

# ДАРОЖНАЯ КАРТА СУПРАЦОЎНІЦТВА

## стане вынікам візіту ў нашу краіну губернатара Арлоўскай вобласці

**Пра гэта ішла размова на сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з губернатарам расійскага рэгіёна Вадзімам Патомскім.**

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на падабенства эканамічнага ладу Беларусі і Арлоўскай вобласці. «Як Беларусь, так і Арлоўшчына зарабляюць свае грошы розумам і працай людзей», — сказаў беларускі лідар.

Прэзідэнт лічыць, што ў Беларусі і Арлоўскай вобласці ёсць добрыя перспектывы супрацоўніцтва ў такіх сферах, як сельская гаспадарка, прамысловасць, у тым ліку горназдабыўная, машынабудаванне, будаўніцтва. Кажучы пра сферу АПК, кіраўнік дзяржавы адзначыў узаемную цікавасць бакоў да ўзаемадзеяння ў гэтай галіне. Так, Беларусь гатовая пастаўляць увесь набор сельгастэхнікі. Беларускі бок таксама гатовы да рэалізацыі інфраструктурных праектаў.

«Словам, мы гатовыя дзяліцца вопытам з вамі. І ў вас шмат добрых пачынанняў, яны нам вельмі спатрэбяцца», — падкрэсліў Прэзідэнт.

У сваю чаргу губернатар Арлоўскай вобласці адзначыў, што бакі могуць нарошчваць супрацоўніцтва як у сферы харчавання, так і ў машынабудаванні, а таксама па іншых кірунках.

Губернатар прапанаваў стварыць у Арлоўскай вобласці буйны лагістычны цэнтр для беларускай прадукцыі. Аляксандр Лукашэнка падтрымаў гэтую ініцыятыву, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

На выніках сустрэчы дасягнута дамоўленасць аб распрацоўцы дарожнай карты супрацоўніцтва, у якой будуць вызначаны тэрміны рэалізацыі сумесных праектаў.

# КАЛІЙНЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам генеральнага дырэктара Беларускай калійнай кампаніі Алену Кудравец.**

Кіраўнік дзяржавы цікавіўся станам спраў у галіне, у прыватнасці вынікамі працы БКК за 2015 год, а таксама знешняй кан'юнктурай — сітуацыяй на сусветных рынках і ў вядучых вытворцаў калію, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

Як далажыла Алена Кудравец, у мінулым годзе кампанія пастаўляла на экспарт 9,2 млн т беларускіх калійных угнаенняў, што на 3,1% менш за вынік 2014 года. Пры гэтым, паводле звестак Міжнароднай Асацыяцыі вытворцаў угнаенняў, сусветны аб'ём экспартных паставак у 2015 годзе скараціўся на 5,7%. Разам з тым, доля Беларускай калійнай кампаніі ў сусветным экспарце павялічылася з 18,8% у 2014 годзе да 19,3% у 2015 годзе.

Генеральны дырэктар БКК адзначыла, што падчас сумеснай працы з «Беларуськаліем» кампанія арыентуецца на рэальныя патрэбы рынку, імкнучыся ўзважана і адказна падыходзіць да пытання вытворчасці і продажу, гнутка рэагаваць на змены попыту і падтрымліваць баланс на калійным рынку.

■ Развагі па сутнасці

## Марыяна ШЧОТКІНА:

# «СЯРЭДНІ ПАМЕР ПЕНСІІ ПАВІНЕН ПАВЯЛІЧВАЦЦА»

## Добраахвотнае страхаванне палепшыць матэрыяльнае становішча будучых пенсіянераў



**Грамадскае абмеркаванне неабходнасці павышэння пенсійнага ўзросту, каб захаваць узровень пенсійных выплат у будучым, працягваецца. У газетах, на радыё і тэлебачанні ладзяцца «прамыя лініі» ды дыскусіі экспертаў на гэтую тэму. Адзін з апошніх «круглых сталоў», прысвечаны пытанням чакаемай рэформы, прайшоў з удзелам міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Марыяны Шчоткінай. На яе думку, «зніжаць узровень пенсійных выплат недапушчальна», паведамляе БЕЛТА.**

«Задача сёння для ўсіх адна: сярэдні памер пенсіі павінен павялічвацца, — падкрэсліла Марыяна Шчоткіна. — Нехта прапануе для гэтага павысіць працэнт адлічэнняў у фонд сацыяльнай абароны: замест аднаго працэнта, які выплачвае работнік цяпер, прапануюць адлічваць два. Наша меркаванне наконт гэтага — няхай лепш гэты працэнт работнік накіруе на добраахвотнае пенсійнае страхаванне».

Тэма добраахвотнага пенсійнага страхавання шырока абмяркоўвалася на «круглым стале». На думку многіх удзельнікаў, яно дасць магчымасць, не ламаючы цяперашнюю салідарную сістэму, дыферэнцыраваць пенсійныя выплаты і палепшыць матэрыяльнае становішча будучых пенсіянераў. Цяпер заканадаўства прадугледжвае магчымасць страхавання дадатковай пенсіі як з боку работнікаў, так і з боку наймальнікаў. Прафсаюзныя камітэты пэўных прамысловых прадпрыемстваў дабіліся ўключэння ў калектыўныя дагаворы нормы аб дадатковым пенсійным страхаванні. Удзельнікі «круглага стала» сышліся на думцы, што такая практыка павінна атрымаць больш шырокае распаўсюджванне.



**Міхаіл ОРДА:**

***«Нельга дапусціць, каб у выніку пенсійнай рэформы пацярпела моладзь»***

Старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (ФПБ) Міхаіл Орда заявіў, што ў пенсійным фондзе існуе дэфіцыт сродкаў. Калі не прымаць меры, то з кожным годам ён будзе ўсё больш адчувальны. «У такой сітуацыі дзяржава, па сутнасці, стаіць перад выбарам: або павышаць пенсійны ўзрост, або змяншаць пенсійныя выплаты. З апошнім прафсаюзы, безумоўна, не могуць пагадзіцца. Наадварот, мы гаворым, што трэба індэксаваць пенсійныя выплаты». На думку кіраўніка ФПБ, павышэнне пенсійнага ўзросту павінна праходзіць паэтапна і кампенсавацца рэальнымі механізмамі абароны на рынку працы самых слабаабароненых катэгорый — моладзі і людзей перадпенсійнага ўзросту.

«Указ №78 абавязвае штогод ствараць 50 тысяч працоўных месцаў. У сувязі з гэтым трэба больш шырока развіваць сферу паслуг, ствараць высокатэхналагічныя, канкурэнтаздольныя прадпрыемствы, дзе знайшла б сваё прымяненне моладзь, — адзначыў Міхаіл Орда. — У сітуацыі павышэння пенсійнага ўзросту менавіта яна можа пацярпець больш за ўсё, паколькі наймальнік заўсёды аддасць перавагу вопытнаму работніку. У выніку атрымаем старэнне працоўных калектываў, цяжкасці з укараненнем новых тэхналогій».

Беларускае заканадаўства прадугледжвае гарантыі для асоб перадпенсійнага ўзросту, зарэгістраваных беспрацоўнымі, пры немагчымасці іх працаўладкавання. У тым ліку яны могуць датэрмінова выйсці на пенсію па ўзросце. Гэта можна зрабіць за два гады да дасягнення ўстаноўленага пенсійнага ўзросту, калі чалавек звольнены ў сувязі з ліквідацыяй арганізацыі. На год раней можна пайсці на пенсію ў тым выпадку, калі ў жанчыны ёсць стаж работы 33 гады, а ў мужчыны — 38.

Указ №180 ад 12 красавіка 2000 года прадпісвае, што пры заключэнні кантрактаў з добрасумленнымі работнікамі, якім да пенсіі засталося два гады і менш, а таксама пры прадаўжэнні кантрактаў з імі тэрмін дзеяння кантракта вызначаць не менш чым да дасягнення агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту і атрымання работнікам права на пенсію па ўзросце. Генеральнае пагадненне паміж урадам Беларусі, рэспубліканскімі аб'яднаннямі наймальнікаў і прафсаюзаў на 2016—2018 гады прадугледжвае яшчэ больш ільготную норму: уключаць у калектыўныя дагаворы палажэнне аб пашырэнні такой гарантыі пры кантрактнай форме найму на тых, каму да пенсіі засталося тры гады і менш. Для такіх асоб у калектыўных дагаворах неабходна замацоўваць пераважнае права на пакіданне на працы пры скарачэнні колькасці або штату работнікаў.

**Падрыхтавала Надзея ДРЫЛА.**

■ На слыху

# УКАЗ АБАВЯЗКОВЫ ДЛЯ ЎСІХ

## ТАМУ ТАРЫФЫ НА ЖКП СЁЛЕТА ПАВЯЛІЧВАЦЦА НЕ БУДУЦЬ

**Прэзідэнт, падпісаўшы адпаведны Указ №107 «Аб аплаце жыллёва-камунальных паслуг, якія аказваюцца насельніцтву», зацвердзіў гранічна дапушчальныя цэны (тарыфы) у 2016 годзе на 14 відаў жыллёва-камунальных паслуг.**

Цяпер упершыню ў адным дакуменце сабраны ўсе тарыфы на асноўныя жыллёва-камунальныя паслугі, як тыя, што субсідзіруюцца, так і поўныя, якія будуць абавязковымі для прымянення на ўсёй тэрыторыі краіны, паведаміў **міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Аляксандр ЦЕРАХАЎ** падчас «круглага стала» «Плата за ЖКП: новыя тарыфы і падыходы» ў прэс-цэнтры БЕЛТА.

Міністр адзначыў, што агучаныя лічбы з'яўляюцца гранічнымі, а гэта азначае, што вышэй вызначаных паводле Указа №107 тарыфаў быць проста не можа. Такім чынам, было выканана патрабаванне Прэзідэнта Беларусі аб тым, каб чалавек мог дакладна пралічыць кошт такіх паслуг па сваёй кватэры. Галоўнымі новаўвядзеннямі дакумента, паводле слоў Аляксандра Церахава, стане змяненне трох асноўных тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі. У мэтах зніжэння фінансавай нагрузкі для насельніцтва указам **памяншаюцца тарыфы на паслугі водазабеспячэння ў 1,7 раза** (з 4765,9 рубля да 2790 рублёў за 1 кубічны метр), **водаадвядзення — больш чым у 2,2 раза** (з 4148,8 рубля да 1863 рублёў за «куб»). **Тарыф на тэхнічнае абслугоўванне ліфта цяпер складзе 6911 рублёў на аднаго зарэгістраванага** ў кватэры чалавека. Гэты тарыф у параўнанні са студзеньскім практычна паменшаны на 30%.

Упершыню зацверджаны тарыф на санітарную прыборку памяшканняў агульнага карыстання. Гранічная лічба гэтага тарыфу складае 5300 рублёў з зарэгістраванага ў кватэры жыхара. Вызначаны таксама тарыфы на асвятленне месцаў агульнага карыстання і на электраэнергію рухання ліфта. Па ліфтах тарыф складае 2600 рублёў з чалавека, а па асвятленні — 3900 рублёў.

Больш падрабязна аб агучаных новаўвядзеннях — у наступным нумары газеты.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Факт

# ПАДЧАС ТЭРАКТУ Ў БРУСЕЛІ ПАЦЯРПЕЛІ ТРОЕ НАШЫХ ГРАМАДЗЯН

«Пасля ідэнтыфікацыі пацярпелых ад тэрактаў бельгійскі бок паведаміў пра шпіталізацыю трох грамадзян Беларусі», — адзначылі ў прэс-службе Міністэрства замежных спраў Беларусі.

На шчасце, пашкоджанні аказаліся нязначнымі і пацярпелыя ўжо выпісаны з бальніцы. Устаноўлены кантакт з іх сваякамі.


**Информация о результатах финансово-хозяйственной деятельности открытого акционерного общества «Сейсмотехника» за 2015 год**

| № строки | Наименование показателей | Единица измерения | 2015 год |
|---|---|---|---|
| 1. | Выручка от реализации товаров, продукции, работ и услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей) | миллионов рублей | 392 134 |
| 2. | Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | миллионов рублей | 382 587 |
| 3 | Прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг | миллионов рублей | 9 547 |
| 3.1. | Прибыль (убыток) от текущей деятельности | миллионов рублей | 6 628 |
| 3.1. | Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности | миллионов рублей | -108 635 |
| 3.2. | Прибыль до налогообложения | миллионов рублей | -102 007 |
| 4. | Налоги и сборы, платежи и расходы, производимые из прибыли | миллионов рублей | 0 |
| 5. | Чистая прибыль (убыток) | миллионов рублей | -102 007 |
| 6. | Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | миллионов рублей | -109 651 |
| 7. | Просроченная дебиторская задолженность | миллионов рублей | 385 |
| 8. | Просроченная кредиторская задолженность | миллионов рублей | 4 807 |
| 9. | Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | миллионов рублей | 0 |
| 10. | Дивиденды на одну акцию, выплаченные в данном отчетном периоде | рублей | 0 |
| 11. | Количество акционеров, всего | лиц | 170 |
| | в том числе: | | |
| 11.1. | юридических лиц | лиц | 2 |
| 11.2. | физических лиц | лиц | 168 |
| 12. | Среднесписочная численность работающих | человек | 512 |
| 13. | Обеспеченность акции имуществом общества | тыс. рублей | 4,7 |
| 14. | Стоимость чистых активов | миллионов рублей | 30 884 |

Основной вид деятельности – Производство машин и оборудования для горнодобывающих производств, подземной разработки и строительства

УНП 400079509

В **суд Слуцкого района Минской области** поступило заявление с просьбой ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о ДРУЖИНЕ Владимире Васильевиче, 19 сентября 1971 года рождения, уроженце д. Новобелица Сенненского района Витебской области, проживавшего в городе Слуцке по ул. Советской, д. 58, сообщить их суду в течение двух месяцев.

УНН 600038919

**ОАО «Світанак» г. Жодино приглашает организации принять участие в переговорах по выполнению строительно-монтажных работ на объекте: «Электроснабжение электроводонагревателя в нежилом (арендуемом) помещении магазина №7 ОАО «Світанак» по ул. Советская, 98 в г. Барановичи».**

Заявки принимаются по адресу: г. Жодино, ул. 8 Марта, 1 до 10.00 04.04.2016 г. За дополнительной информацией обращаться по тел.: 8(01775) 7-14-92, 7-97-74.

■ Выгадныя грошы

# РАСІЙСКІЯ ЎКЛАДЧЫКІ ПАЙШЛІ Ў НАШЫ БАНКІ

## ШТО НА АЙЧЫННЫХ ДЭПАЗІТАХ ЛЕПШАЕ, ЧЫМ У СУСЕДНІХ КРАІНАХ

**Некаторыя мае сябры айчынныя банкі сур'ёзна не ўспрымаюць, іншыя — ставяцца да іх з асцярогаю. Аднак цяпер (звычайна сярод моладзі) ёсць і такія, што гуляюць з фінансавымі ўстановамі «па-сур'ёзнаму». Гэта мае назіранні. А цяпер аб фактах. У Беларусі пайшла «другая хваля» цікавасці расійскіх грамадзян з грашыма да нашых банкаўскіх дэпазітаў. Падобная тэндэнцыя відавочная сёння не ў адным асобным банку. За апошні год аб'ём такіх, менавіта расійскіх, укладаў у многіх камерцыйных банках краіны павялічыўся на 10—30% у доларавым эквіваленце.**

Мне крыху дзіўна ўспрымаць той факт, што жыхары такой вялікай і багатай суседняй краіны спецыяльна наведваюць нашы банкі, каб пакласці туды свае грошы. Тады атрымліваецца, што нашы банкі ім больш падабаюцца, чым свае. Чаму?

### ДАСПАДОБЫ ІСТОТНЫ ДАХОД І... СУР'ЁЗНАЕ СТАЎЛЕННЕ ДЗЯРЖАВЫ

Расіяне галасуюць за беларускія банкі рублём. І гэта нягледзячы на змяненне ўмоў: спачатку дзяленне ўкладаў на адзыўныя і безадзыўныя, а пасля — спагнанне з працэнтаў ад укладу падаходнага падатку з 1 красавіка. У прэс-службе аднаго камерцыйнага банка карэспандэнту «Звязды» паведамілі, што найбольшы прырост дэпазітаў з боку расіян прыйшоўся менавіта на перыяд пасля ўступлення ў сілу Дэкрэта №7 (які гэты самы падатак і прадугледжвае) — з сярэдзіны лістапада да пачатку 2016 года іх партфель папаўнеў больш чым на 17%, тады як за папярэднія месяцы — толькі на 9%. А ўсяго за год у гэтым банку аб'ём расійскіх укладаў павялічыўся на 28%.

**Усё большую цікавасць да нашых дэпазітаў праяўляюць жыхары еўрапейскіх краін, бо цяпер многія еўрапейскія банкі ўжо прапануюць не толькі нулявую, але і адмоўную даходнасць па дэпазітах.**

Падобная рэакцыя замежных кліентаў на выхад у свет згаданага дэкрэта мае сваю логіку. Расійскія ўкладчыкі цяпер дакладна ведаюць умовы фінансавай гульні з дэпазітамі. У дакуменце зразумела прапісана, хто і ў якіх выпадках павінен плаціць падаходны падатак на працэнтны даход з укладаў. А галоўнае, што дзяржава ў любым выпадку гарантуе ўкладчыкам вяртанне сваіх сродкаў пры выкананні пэўных умоў захоўвання грошай у банкаўскай сферы.

Кліентам з-за мяжы імпануе і тое, як сітуацыю ў фінансавым бізнесе, часам няпростую, кантралюе наш Нацыянальны банк. Напрыклад, беларускі рэгулятар даволі рашуча і своечасова спыніў дзейнасць аднаго прыватнага ўкраінскага банка (Дэльта-Банк). Больш за тое, папярэдне ў гэтым банку было ўведзена Нацбанкам знешняе кіраванне, што не дазволіла прыватнаму бізнесу перавесці грашовыя сродкі кліентаў за мяжу, або пераафарміць на іншых юрыдычных асоб свае актывы на тэрыторыі Беларусі. Бізнес потым адрэагаваў на гэта нервова, але ўкладчыкі атрымалі чарговае пацвярджэнне таму, што грошы ім абавязкова вернуць.

### БАГАТЫХ КЛІЕНТАЎ СТАЛА БОЛЬШ

Спецыялісты адной фінансавай установы — (Альфа-Банк (Беларусь) — вырашылі зрабіць раскладку сваіх замежных кліентаў. Было выяўлена, што сярод расійскіх укладчыкаў нямала заможных людзей са зберажэннямі ад 100 тысяч долараў і больш. Пры гэтым сярэдні памер «расійскага» дэпазіту за мінулы год павялічыўся на 13,5% і цяпер складае каля 40 тысяч долараў у эквіваленце.

Таксама ў банку паведамілі, што рост цікавасці да ўкладаў тлумачыцца параўнальна высокай даходнасцю, бо ў Беларусі стаўкі па валютных дэпазітах у 1,5-2 разы вышэйшыя, чым у Расіі. І гэта нават з улікам прагназуемых адлічэнняў у выглядзе падаходнага падатку з працэнтнага даходу. Акрамя таго, укладчыкаў з суседняй краіны прыцягвае гарантаваны дзяржавай безумоўны механізм кампенсацыі ўкладаў насельніцтву.

### КЛАДУЦЬ ВАЛЮТУ І НАВАТ РУБЛІ

Жыхары суседняй дзяржавы часцей за ўсё адкрываюць дэпазіты ў доларах і еўра. І хоць стаўкі па ўкладах у беларускіх рублях значна вышэйшыя (каля 30% гадавых), укладчыкаў насцярожваюць ваганні нацыянальнай валюты. «Вялікую ролю тут адыгрывае псіхалагічны фактар. Хоць, калі параўнаць уклады ў беларускіх рублях і замежнай валюце па даходнасці ў доларавым эквіваленце, то ў кароткачасовым «моманце» дэпазіты ў беларускіх рублях у 1,3—1,4 раза больш выгадныя за валютныя», — растлумачылі ў банку. Таму ўсё часцей «прасунутыя» кліенты адкрываюць уклады адразу ў некалькіх валютах, у тым ліку і ў беларускай.

Цяпер у невялікіх прыватных банках на расіян прыпадае ад 2% да 9% банкаўскіх укладаў, а, напрыклад, іх доля (8%) у партфелі дэпазітаў




Альфа-Банка за апошні год павялічылася прыкладна на 1%. Спецыялісты банкаўскага сектара прагназуюць, што і сёлета такая тэндэнцыя захаваецца з улікам складанасцяў у расійскай эканоміцы і чаканага захавання прывабнасці ўкладаў у беларускіх банках.

### УСЁ ПАЗНАЕЦЦА Ў ПАРАЎНАННІ

Сярод расійскіх укладчыкаў нямала тых, хто працуе ў Беларусі. І, што цікава, у беларускі рубель яны вераць істотна больш. «Тут усё проста, бо тэмпы дэвальвацыі беларускага рубля некалькі ніжэйшыя, чым расійскага, а даходнасць па дэпазітах у 2,5-3 разы вышэйшая. Таму многія кліенты выкарыстоўваюць простую схему, каб назапасіць на буйныя пакупкі: пераводзяць частку заробку на дэпазіт у беларускіх рублях, зарабляюць на працэнтах, а потым робяць шопінг у Расіі», — патлумачылі спецыялісты банкаўскага сектара.

### З'ЯВІЛІСЯ І VIP-КЛІЕНТЫ З ЕЎРОПЫ

Шматлікія ўкладчыкі з Расіі адкрываюць рахункі на сумы ад 100 тысяч долараў і больш. У гэтым выпадку яны бясплатна карыстаюцца магчымасцямі эксклюзіўнага абслугоўвання — так званым private-banking. Для іх прадугледжаны абаронены канал «распараджэнняў», які дазваляе кіраваць укладам праз персанальнага менеджара. Пазбегнуць высокай камісіі пры зняцці сродкаў на радзіме атрымоўваецца дзякуючы «роднасным» сувязям беларускага і расійскага філіялаў (аддзяленняў) сумесных банкаў.

**Калі параўнаць уклады ў беларускіх рублях і замежнай валюце па даходнасці ў доларавым эквіваленце, то ў кароткачасовым «моманце» дэпазіты ў беларускіх рублях у 1,3—1,4 раза больш выгадныя за валютныя».**

Больш за тое, сярод актыўных укладчыкаў такіх банкаў не толькі грамадзяне Расіі. Усё большую цікавасць да нашых дэпазітаў праяўляюць жыхары еўрапейскіх краін, такіх як Італія, Германія, Францыя, Швейцарыя, Польшча, а таксама прыбалтыйскіх дзяржаў. Як правіла, кліенты з Еўропы карыстаюцца сістэмай абслугоўвання ўзроўню private-banking. Відавочна, што для іх умовы ў Беларусі вельмі прывабныя, бо цяпер многія еўрапейскія банкі ўжо прапануюць не толькі нулявую, але і адмоўную даходнасць па дэпазітах.

У бліжэйшыя месяцы істотных зменаў у партфелі ўкладаў не адбудзецца, лічаць эксперты. «Палітыка Нацбанка цяпер накіравана на стварэнне прадказальнай сітуацыі на фінансавым рынку. Рэгулятар імкнецца стабілізаваць рэсурсную базу банкаў і абмяжоўваць рост грашовай прапановы з мэтай зніжэння інфляцыі. Тым не менш у параўнанні з Расіяй умовы для «працы» грошай у Беларусі застаюцца значна больш прывабнымі», — адзначаюць нават незалежныя эксперты банкаўскай сферы.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

# ПАЛЕСКІЯ ЛОДКІ ПІНЧУКА





***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

У вольны час (а Уладзімір Васілевіч працуе кантралёрам дрэваапрацоўчага цэха) майстар заняты падрыхтоўкай новых рачных плывучых сродкаў: на сваім падворку апрацоўвае дрэваматэрыялы, нарыхтоўвае какоры, робіць насы, назапашвае мох для канапачання.

— У дзесяць гадоў я памагаў свайму бацьку рабіць лодкі, вучыўся ў яго, а потым і сам стаў майстраваць, — кажа хваенскі лодачнік.



За свае 59 гадоў Уладзімір Пінчук вырабіў не адзін дзясятак лодак, дзякуючы яму, традыцыйнае рамяство на Палессі не забыта, працягвае жыць.

На гэтых здымках Уладзімір Пінчук на сваім падворку заканчвае працу над новымі лодкамі. Лодкі Пінчука чакаюць на прыпяцкіх берагах новага навігацыйнага сезона.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**
*anatol@zviazda.by*
*Жыткавіцкі раён.*
*Больш здымкаў — на сайце zviazda.by*

■ Неасабісты суб'ектыў



# ПАРАЛЕЛІ, ШТО ПЕРАСЯКАЮЦЦА

### Паміж жудасным панядзелкам Хатыні і чорным аўторкам Бруселя — роўна 73 гады

КАЛІ ўяўляць гарады, у якіх давялося бываць, па колеры, Бруселю, несумненна, дастанецца цёмна-сіні са сталёвымі праблiскамі. Мабыць, гэта з-за вялікай колькасці мадэрновых адміністрацыйных будынкаў, закаваных у цёмнае шкло. У іх адлюстроўваецца рэдка прыветлівае з-за блізкага Ла-Манша неба, таму горад стварае ўражанне надзвычай дзелавога і не вельмі здатнага на нейкія пачуцці.

Але ў мінулы аўторак усе гэтыя асацыятыўныя ўяўленні абрынуліся ад выбухаў, што скаланулі горад. Людзям там было балюча і страшна. Людзі плакалі і клікалі на дапамогу. Чалавечы боль і чалавечае гора не сталі нейкімі іншымі ў антуражы сучаснай еўрапейскай сталіцы з усімі выгодамі цывілізацыі.

УВОГУЛЕ для мяне асабіста мінулы аўторак быў страшным днём, якія рэдка здараюцца ў жыцці. Кожны год 22 сакавіка я прачынаюся з нейкім трывожным адчуваннем, падсвядомым страхам, што здарыцца штосьці жудаснае. Не ведаю, адкуль гэта штогод бярэцца, за працай я нярэдка забываюся, якое заўтра чысло, але менавіта ў той дзень, калі фашысты спалілі Хатынь, з першых ранішніх крокаў нейкі неспакой цвеліць душу.

Гэта жыве са мной гадоў з дванаццаці, калі, вярнуўшыся з Хатыні, куды нас вазілі на канікулах, я сярод спякотнага ліпеня звалілася з тэмпературай пад сорак. Родныя не маглі даць рады невядомай хваробе цэлы тыдзень, урачы разводзілі рукамі: «Можа, што здарылася ў той паездцы, можа, быў які стрэс і гэта нервовае?» Настаўнікі, што былі з намі, абсалютна шчыра казалі, што ўсё было спакойна. А я ў той летняй ліхаманцы гарэла не ад тэмпературы — заплюшчваючы вочы, я зноў і зноў задыхалася ад дыму ў падпаленай хаце, крычала, стукалася ў замкнутыя дзверы, а побач задыхаліся, крычалі і плакалі людзі... Праз тыдзень я ачуняла, але боль Хатыні, які нейкім невядомым астральным чынам стаў часткай маёй існасці, штогод, бы старая стрэмка, дае пра сябе знаць менавіта 22 сакавіка, нават калі не памятаеш, якое на двары чысло. І ходзіш цэлы дзень са сваімі цяжкімі думкамі, і глядзіш у халоднае сакавіцкае неба вачыма кагосьці з тых, хто бачыў яго ў сорак трэцім апошні раз...

А сёлета цяжкія прадчуванні гэтага дня спраўдзіліся. І пацямнела ў вачах ад чалавечага страху і болю, і замітусіліся думкі — ад невялікай лясной вёсачкі, якая ўжо семдзесят тры гады спіць спакутаваным сном, да далёкага горада, у якім, побач з якім — сябры, знаёмыя, проста людзі, з якімі сустракаўся ў тым аэрапорце, ездзіў у тым метро... Сцерліся адлегласці і вымярэнні часу, засталося толькі гэта — чалавечыя боль і страх.

Я не прыхільнік містыкі, але ўсё ж думаю, што супадзенне дат тут невыпадковае. Занадта шмат апошнім часам гучыць, у тым ліку з высокіх еўрапейскіх трыбун, фраз пра тое, што фашысцкія лагеры былі ў большасці сваёй не канцэнтрацыйнымі, а працоўнымі, што жыхары акупаваных тэрыторый ехалі ў рабства на захад добраахвотна, што над нашымі дзецьмі не ставілі эксперыменты — іх выхоўвалі, што нашы вёскі гарэлі разам з людзьмі выключна па віне нас саміх — маўляў, калі б не партызанскае супраціўленне, дык і акупанты былі б белымі і пушыстымі. І здарылася так, што боль Хатыні, Трасцянца, Ямы, соцень іншых месцаў, дзе семдзесят з невялікім гадоў таму людзі паміралі пакутлівай смерцю, стаў толькі нашым болем. Талерантная Еўропа яго пазбавілася, выкрасліла з памяці.

Толькі разам з гэтым болем яна амаль дазвання выкрасліла вельмі важнае веданне, якім мы валодаем і сёння, бо наш боль і наша памяць заўжды з намі. У нелюдзяў няма логікі і шкадавання. Забойцы, якія лічаць сябе (свой народ, рэлігію) вышэйшымі над іншымі, адзіна правільнымі, гатовыя знішчаць усіх, хто адрозніваецца ад іх. З імі нельга дамовіцца, іх немагчыма задобрыць. Яны, калі прыйдуць да цябе ў дом, не будуць нават спрабаваць зразумець парадак, які ўім пануе, не будуць любавацца тым, што ты лічыш найвялікшымі каштоўнасцямі, — яны проста ўсё гэта спаляць разам з табой. Адсутнасць гэтага ведання як вынік адмовы ад гістарычнай праўды мінулай вайны — адна з прычын таго, што адбываецца сёння на нашым бедным кантыненце.

Цяпер у агульнай гісторыі ёсць яшчэ адна жалобная дата — 22 сакавіка 2016-га. Штогод, згадваючы тых, хто гарэў у Хатыні, мы будзем успамінаць і тых, каго рвалі на кавалкі бомбы ў Бруселі. І званы Хатыні будуць плакаць па іх таксама.

Можа, іх звон стане чуваць далей?

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

# «УСЯ ВЁСКА Ў ШОКУ»



Аляксандр ЧАЛЕЙ паказвае месца трагедыі.



Святлана дзякуе Богу, што сын застаўся жывы.







Праваахоўнікі разбіраюць сітуацыю.

Фота Надзеі БУЖАН.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Чалей, начальнік інспекцыі па справах непаўнагадовых Бярэзінскага РАУС, за час службы ў міліцыі бачыў многае, але каб дзеці падрываліся... З падобным ён сутыкнуўся ўпершыню. Разам з ім мы накіроўваемся ў Вяшэўку, невялічкую вёску, за якой, у кукурузным полі, і здарылася трагедыя.

— 23 сакавіка паралельна паступілі два званкі, — расказвае Аляксандр. — Адзін з бальніцы, куды даставілі падлетка з ірванай ранай сцягна і галёнкі. Другі — ад жыхаркі Вяшэўкі. Яна паведаміла аб тым, што яе сын каля 16:00 пайшоў гуляць з сябрамі і з таго часу яго месцазнаходжанне невядома. Аказалася, што яшчэ аднаго хлопца няма дома. Выехалі на месца. Мясцовыя сваімі сіламі распачалі пошукі: правяралі сады, адрыны, двары... Паранены хлопчык напачатку нічога не казаў, але пасля высветлілася, што гуляць яны пайшлі ў поле.

Па папярэдняй інфармацыі, дзеці знайшлі прадмет невялічкага памеру. Падлеткі — асобы цікаўныя. Спачатку кідалі яго ў зямлю, а калі ўбачылі валун, кінулі ў яго. Адбыўся выбух. Той, што застаўся жывы, вярнуўся дадому. Целы загінулых знайшлі ўжо пасля апоўначы.

Тым часам у вёсцы працуюць супрацоўнікі Следчага камітэта. Поле ўжо праверыў сапёрна-піратэхнічны разлік з сабакам. Яно, вялікае, зацярушанае снегам, здаецца бязмежным. Рушым па ім да злашчаснага месца. Яшчэ хвілін пяць хады — і перад намі той самы камень. Непадалёк — прымятая трава, засохлая кроў.

Рабіць высновы зарана. Ідзе расследаванне. Але, відавочна, дзяцей адкінула выбуховай хваляй. Як лічыць суразмоўца, прывесці да такой трагедыі магло дзіцячае свавольства, няведанне.

Як кажа Аляксандр Чалей, ні дзеці, ні сем'і ў поле зроку міліцыі не трапялі. Ніхто дрэннага пра іх не казаў. У двух загінулых хлопцаў поўныя сем'і, шматдзетныя. Бацькі працуюць на ферме.

Мы сустрэлі Святлану, маці параненага 10-гадовага Вані, каля дома. Жанчына заходзіць у хату, але праз некалькі хвілін вяртаецца, каб пагутарыць з намі. Толькі просіць доўга не затрымліваць. Відаць, што ёй размаўляць складана і яна ўжо стамілася ад нечаканай увагі. Яна сёння ўжо была ў бальніцы і ўвечары збіраецца зноў наведаць сына.

— А палове на шостую сын вярнуўся дадому. Нічога не сказаў. Але я заўважыла, што ён брудны, і пачала распытваць сама. Сказаў, што нічога страшнага, зваліўся з веласіпеда. Я паверыла і паехала на працу. Калі вярнулася, убачыла, што на ягонай назе глыбокая рана. Выклікалі хуткую дапамогу, яго адправілі ў бальніцу. Сёння доктар мне паведаміў, што ён у добрым стане. Хоць у яго шок. Плача. Прызнаўся, што пабеглі гуляць з сябрамі на поле. Мой пляменнік знайшоў там іржавую жалязяку. Сын стаміўся. Вырашыў вяртацца. Адышоў далей. І калі пляменнік кінуў яе аб камень, выбухнула.

***— Сярод загінулых ваш сваяк?***

— Адзін — сын маёй сястры, другі — сяброўкі. Яны з самага дзяцінства разам гулялі. Заўжды былі разам. Добрыя хлопцы былі...

Як гавораць мясцовыя жыхары, на пошукі кінулася амаль уся вёска. Усе ў шоку ад таго, што здарылася. Па папярэдняй інфармацыі, выбухнуў снарад часоў Вялікай Айчыннай вайны. Ён, атрымліваецца, чакаў свайго часу.

* * *

Усе хлопчыкі вучыліся ў суседняй вёсцы Пагост. Туды мы і накіраваліся з Вяшэўкі.

— Па вучобе заўваг у дачыненні іх не было. Звычайныя добрыя хлопчыкі. Вучыліся ў другім, трэцім і чацвёртым класах. Удзельнічалі ў спаборніцтвах па спартыўным арыентаванні. І такога ніколі не здаралася, каб нашы вучні знаходзілі боепрыпасы. У дзень трагедыі яны былі на аздараўленчай пляцоўцы ў школе. Зараз канікулы. А пасля паехалі дадому, — кажа Аляксей Сарнаўскі, дырэктар установы адукацыі «Пагосцкі дзіцячы сад — сярэдняя школа».

***— А ці праводзілі з дзецьмі заняткі па асновах бяспекі?***

— Безумоўна. Падобнае мерапрыемства праходзіла 4 сакавіка, напярэдадні канікул. У ім удзельнічалі ратавальнікі. Дзецям казалі, каб незнаёмыя прадметы, падобныя на гранаты, снарады не чапалі, а паведамлялі бацькам, дарослым. Падобныя перасцярогі мы паўтараем пастаянна.

Тым часам, стала вядома, што расследаванне ўзята пад асаблівы кантроль кіраўніцтва Следчага камітэта. Заведзена крымінальная справа.

**Тарас ШЧЫРЫ.**
*taras@zviazda.by*

*Бярэзінскі раён.*



Вольга САХАРАВА:

TV@R

# «ТЭЛЕБАЧАННЕ ЯК МАГЧЫМАСЦЬ ДЛЯ ТВОРЧАСЦІ»

**Праграма «Мінск і мінчане» тэлеканала СТБ кожны тыдзень збірае каля экранаў усіх тых, хто не толькі любіць беларускую сталіцу, але і з цікавасцю адкрывае для сябе старонкі яе гісторыі. У сакавіку праект, можна сказаць, адзначае свой 14-ы год нараджэння. За гэты час змяніўся горад, змянілася сама перадача, але незнікла яе запатрабаванасць у гледачоў. За кошт чаго ёй удаецца не страчваць сваіх эфірных пазіцый і якая за кадрам яе вядучая Вольга Сахарава, мы паспрабавалі даведацца з першых вуснаў.**



***— Вольга, ваша праграма амаль што равесніца самога тэлеканала...***

— Не ведаю, ці можна казаць, што праграме «Мінск і мінчане» 14 гадоў, бо першапачаткова яна пачыналася з сюжэтаў, замалёвак пра горад, якія выходзілі паміж праграмамі. А з часам ператварылася ў паўнавартасны прадукт.

***— Вы прыйшлі працаваць на тэлеканал СТБ у пачатку 2006 года і пачалі рабіць гэты праект. Чаму абралі менавіта такую нішу?***

— Да прыходу сюды я працавала на адным з тэлеканалаў прэс-сакратаром. Аднак паколькі з'яўляюся чалавекам творчым, журналістам, то мне стала «цесна» на той пасадзе. Я са школы працую на тэлебачанні, таму здымак мне вельмі не хапала. І калі на СТБ прапанавалі ўзяць любы праект і рабіць яго, то я выбрала «Мінск і мінчане». На той момант мяне здзівіла, што наш горад на вачах мяняецца, а праект застаецца ранейшым. Захацелася ператварыць яго ў прыгожы, модны тэлечасопіс. Каб гэта была праграма сённяшняга дня... Нават не планавала, што стану вядучай праекта. Спачатку рыхтавалася працаваць рэдактарам, але калі здымалі пілот праграмы, то трапіла ў кадр. Хоць мы думалі пра тое, каб вядучым быў мужчына. Нават, памятаю, вялі перамовы з Дзмітрыем Шэпелевым, ён тады толькі скончыў журфак БДУ. Пасля здымак пілота кіраўнік тэлеканала спытаў мяне: чаму ты сама не хочаш весці праграму? І я стала вядучай праекта «Мінск і мінчане».

***— Але мужчынскі голас мы ўсё ж такі чуем у праграме. Раскажыце пра каманду, якая стварае з вамі «Мінск і мінчане»?***

— Мужчынскі голас — можна лічыць таксама адной з фішак праграмы. Аўдыторыя ў нас розная... Таму і вырашылі яшчэ шмат гадоў таму, што ў кадры — жаночы голас, а за кадрам — мужчынскі. Калі казаць пра нашу творчую групу, то яна ў нас пастаянная. І я вельмі ўдзячная ўсім, хто вось ужо цэлых дзесяць гадоў побач са мной працуе ў адной звязцы. За гэты час у нас змянілася канцэпцыя — мы зрабілі ўхіл на гісторыю, бо многія з нашых рубрык перараслі ў самастойныя праекты, а за сабой пакінулі не занятую нішу. І як ні дзіўна, я вось цэлае дзесяцігоддзе раблю «Мінск і мінчане» і кожны раз, адкрываючы архіў, разумею, што там яшчэ столькі таямнічых, цікавых старонак — яны не заканчваюцца. А пастаянства, якое назіраецца ў нашай камандзе, можна лічыць своеасаблівым знакам якасці нашай працы. Наш відэаінжынер Юрый Вараб'ёў (ён жа займаецца мантажом) заўсёды настолькі адказна падыходзіць да працы, што мы, бывае, здаём праграму за некалькі гадзін да эфіру. Яму трэба праверыць кожны гук, кадр, бо зняць — адна справа, а зманціраваць — зусім іншая. Юрый Ласута — наш рэдактар праграмы, на плячах якога ляжыць львіная доля працы, бо я сумяшчаю вядзенне праграмы з кіруючай пасадай. У такіх абставінах моцны рэдактар — проста скарб. І, безумоўна, нельга не сказаць пра нашых творчых і таленавітых карэспандэнтаў, якія жывуць праграмай, кожным сюжэтам — Анастасію Макееву, Яну Леановіч.

> **Дзеці вельмі спакойна ставяцца да маёй працы на тэлебачанні. Яны лёгка могуць пераключыць на іншы канал, калі «Мінск і мінчане» ў эфіры.**

***— За час працы над праектам ці выдзялялі вы для сябе нейкія старонкі гісторыі, асоб, якія вас натхняюць на далейшыя, больш глыбокія даследаванні?***

— Я з ліку тых людзей, якія па прыродзе сваёй цікаўныя. І магу сказаць, што для мяне не мае значэння. з імем чалавек ці без, бо можна настолькі любіць сваю справу, што знакамітым становішся ў адно імгненне. Напрыклад, мы нядаўна рабілі праграму пра людзей, якія здымаюць відэа гарадоў з вышыні птушынага палёту. І іх творчасць запатрабаваная, яны — твар нашага горада. І мяне больш здзіўляюць менавіта такія мінчане. А гісторыю і яе герояў можна па-рознаму разглядаць і ацэньваць. Натхняюць заўсёды асобы тых, хто кіруе горадам, бо ён жа сапраўдны «жывы арганізм», дзе ўсё павінна функцыянаваць, пачынаючы з транспарту, ад якога залежыць, як складзецца ваш дзень, і заканчваючы візуальнай прыгажосцю вашага месца пражывання. Нездарма ж гавораць, што калі чалавек прыязджае ў Мінск, то адпачывае душой.

***— Вы самі родам з Мінска. Што значыць «быць мінчанкай»?***

— Я ўвогуле касмапаліт, вельмі люблю падарожнічаць і адкрываць для сябе новыя гарады. Не люблю хадзіць на экскурсіі з гідам, бо мне важна адчуць атмасферу, дух горада. У наш час пры наяўнасці інтэрнэту вандраваць можна не выходзячы з дому. А Мінск для мяне — мой родны дом, куды заўсёды хочацца вяртацца.

***— Напэўна, ёсць і месцы асабліва дарагія сэрцу?***

— Перш за ўсё гэта мікрараён Усход, дзе я жыла ў дамах з мазаікай Аляксандра Кішчанкі. Мастак у кнізе рэкордаў Гінеса за «Габелен стагоддзя». А тое, што ён ствараў мазаіку на фасадах новабудоўляў, мы ў дзяцінстве не ведалі і нават спрабавалі яе абдзіраць. Цяпер на такія рэчы ўжо зусім па-іншаму гляджу. Памятаю, як нам дазвалялі з панарамнай пляцоўкі нашага хмарачоса любавацца салютам (тады нашы дамы былі аднымі з самых высокіх у горадзе)... Такіх успамінаў шмат, і тыя мясціны родныя для мяне. Зразумела, з часам усё мяняецца і мы становімся іншымі, але калі прыязджаеш туды і сустракаеш блізкіх людзей, то нібы вяртаешся ў часе. Яшчэ родным для мяне стаў раён плошчы Перамогі. Тут, лічу, усё асаблівае: і атмасфера, і сам горад. А вось мае сыны ўспрымаюць Мінск проста як адзін з еўрапейскіх гарадоў. Іх захапляюць і здзіўляюць ужо зусім іншыя рэчы.

**— Дарэчы, вашы дзеці сочаць за вашай працай на экране?**

— Тут часцей нейкія ацэнкі я магу атрымаць ад маці ці свекрыві. Прычым яны перш за ўсё звяртаюць увагу на тое, у што я апранута, а потым ужо на змест праграмы. А дзеці вельмі спакойна ставяцца да маёй працы на тэлебачанні. Яны лёгка могуць пераключыць на іншы канал, калі «Мінск і мінчане» ў эфіры, спаслаўшыся на тое, што ўсё самае цікавае я ім ужо расказала. Альбо ім прасцей зайсці на сайт нашага тэлеканала і там паглядзець перадачу, а не чакаць яе ў пэўны час. Я шмат працую, але для дзяцей заўсёды знаходжу час. Дзялюся з імі тым, што мяне хвалюе, пра што думаю ў працэсе працы.

***— На здымках часам здараюцца форс-мажорныя, кур'ёзныя сітуацыі... Вас яшчэ можна ў гэтым сэнсе чымсьці здзівіць?***

— За дзесяць гадоў шмат чаго здаралася. Але я не страчваю ўласцівасці здзіўляцца. І на кожныя здымкі еду, нібы ўпершыню. І заўсёды дзейнічаю па абставінах. Літаральна нядаўна, калі здымалі праграму пра Мінск з вышыні птушынага палёту, стала вядома, што наш аператар баіцца вышыні. Я пра гэта не ведала і не змагла яго папярэдзіць, таму давялося рознымі прыдумкамі зрабіць так, каб здымкі адбыліся. Была згодна нават на тое, што сама буду ў ролі аператара.

***— Значыць, вы той універсальны чалавек, які можа любога замяніць?***

— Так, магу ўсё рабіць сама. Я на тэлебачанні вось ужо 17 гадоў і паспрабавала, паверце, многае. Што тычыцца здымачнага працэсу, то там мяне ўвогуле нічым не спужаеш. Мне проста аднойчы было прасцей самой сесці за мантаж, чым тлумачыць іншаму чалавеку сваё бачанне матэрыялу. Але, на мой погляд, правільна, калі кожны займаецца сваёй справай.

***— Маючы вопыт працы на іншых тэлеканалах, на СТБ вы ўжо 10 гадоў. Чым патлумачыць такое пастаянства?***

